## PROFESSOR ET MENTORIS HONOREM

# 53 ГАДЫ Ў АБДЫМКАХ КЛІО, ЦІ ЭПІЗОДЫ ЖЫЦЦЯ І НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНАЙ ТВОРЧАСЦІ ПРАФЕСАРА В. А. ФЯДОСІКА

З нагоды юбілею майго сябра і калегі Віктара (прабачце – прафесара Віктара Анатольевіча Фядосіка) хацелася б узгадаць многае, што разам пераважыта, разам зроблена, разам асэнсавана. Але абмяжуюся ўспамінамі якраз у большай ступені пра прафесійныя акалічнасці. Усёж-такі для шырокіх колаў калег Віктара Анатольевіча, а тым больш грамадскай супольнасці, ён вядомы як паважаны гісторык, прафесар, загадчык адной з унікальных кафедраў ва ўсёй сістэме вышэйшай школы Беларусі (і не толькі). Аднак для мяне Віктар быў і застаецца аднакашнікам-аднагрупнікам, спартоўцам-цяжкаатлетам, суразмоўцай у прагаворванні тысяч прафесійных і жыццёвых праблем, партнёрам у ранішніх кросах і "маржаваннях" на Камсамольскім возеры, спадарожнікам у восеньскіх "ціхіх паляваннях". Пералік нашых шматгадовых сумесных пераадольванняў жыццёвых сцежак-дарожак можна прадоўжыць бясконца. За 1968–2021 гады не было ніякіх перапынкаў у, калі па-сённяшнему казаць, офлайн і онлайн камунікацыях.

Так сталася, што з Віктарам я пазнаёміўся ўжо ў першыя дні верасня 1968 г., калі калгасны "газон" прывёз нашу толькі-толькі сфарміраваную 2-ю вучэбную групу на студэнцкую традыцыйную "бульбу" у вёску Скнаравічы Мінскага раёну. І цэлы месяц мы ўсе прыціраліся адзін да аднаго, спазнаючы і характар, і здольнасці, і працавітасць, і адказнасць кожнага за даверану справу. І так "прыцёрліся", што большасць захавала той юнацкі настрой на ўсё жыццё. У наступным, якія б не былі новыя абставіны нашых ужо дарослых і прафесійных кантактаў, заўсёды перш-наперш узгадваліся і месяц у Скнаравічах, і ўпартасць (калі не ўпёртасць) у пяцігадовым спасціжэнні "граніта гістарычнай навукі", і інтэрнацкія пасядзелкі, і спаборніцтвы за першаснасць на спартыўных пляцоўках і ў навуковых штудыях у аўдыторыях.

Патрэбна адразу акрэсліць тую акалічнасць, што Віктар-студэнт адразу стаў для сяброў і ўсіх аднакашнікаў узорам. Гэты хлапец выдзяляўся не столькі сваёй хіпаўскай прычоскай, калі валасы літаральна закрывалі і акуляры, і каўнер, а менавіта незвычайнай для большасці студэнтаў гістфака падрыхтаванасцю да ўспрыняцця гістарычнай інфармацыі, яе запамінання, а найбольш важна – публічнага асэнсавання самых дробных фактаў і нейкіх там агульных тэндэнцый ды парадыгм. Для аднагрупнікаў Віктара, большасць з якіх былі выпуснікамі вясковых і райцэнтраўскіх школ, некаторыя ж адслужылі па 2–3 гады ў Савецкай арміі, было дзіўна слухаць свайго таварыша на практычных занятках. Ён літаральна ведаў не толькі інфармацыю па тэмах, зададзеных выкладчыкамі, але заўсёды знаходзіў нікому з нас невядомую. Адшукаць нешта па-за падручнікамі ў невялікай колькасці даступнай літаратуры нам было не пад сілу. Чаго казаць, калі нават у фундаментальныя бібліятэкі – БДУ і Дзяржаўную імя Леніна, можна было патрапіць, толькі адстаяўшы вялікую чаргу. У саміх жа чытальных залях студэнты розных факультэтаў сядзелі, як селядцы ў бочках. Дзе ж там шукаць нешта нейкае, каб здзівіць таварышаў і задаволіць выкладчыкаў. Толькі самае неабходнае засвойвалі самастойна, а так больш спадзяваліся на лекцыйны канспекты.

Толькі праз некаторы час пакрыху вызначылася, што наш Віктар "не роўня" усім нам! Ягоны бацька – акадэмічны навуковец! Кандыдат навук, які вось-вось

павінен абараніць доктарскую дысертацыю. Зразумела, што выдатная падрыхтоўка ну зусім простага і адкрытага хлопца засноўвалася на нейкай асобнай сямейнай ауры. Праз некаторы час, калі сяброўскія повязі замацаваліся праз спорт ды нашы студэнцкія сумесныя мерапрыемствы, адбылося спачатку першае, а потым сталі звычайнымі сотні новых і пастаянных уваходжванняў у кола сям'і Фядосікаў. І замацавалася перакананасць у тым, якое вялікае значэнне мае для нашага развіцця сямейная атмасфера. Бацька Віктара, Анатоль Сямёнавіч, на самой справе быў ужо знакаміты беларускі этнограф, паплечнік "самаго" Васіля Бандарчыка. А разам з тым заўсёды пры сустрэчах у розных абставінах успрымаўся нібыта просты школьны настаўнік, які быў гатовы даць адказ на любое тваё пытанне, і імкнуўся раскрыць у цябе патаемныя інтэлектуальныя рэзервы. Гэты гаспадарлівы мужчына адначасова даваў майстар-класы па адносінах да дабрабыту сям'і, дасведчанасці ў розных хатніх майстэрствах, добразычлівасці і нейкай чалавечай цеплыні. Маці Віктара, Алена Астапаўна, проста натуральна дапаўняла свайго мужа, арыентуючы ўсіх, хто прыходзіў у іх кватэру (спачатку ў "распашонку" па вуліцы Альшэўскай, а пазней у сапраўдную прафесарскую ў такім жа прафесарскім доме-"долары" па вуліцы Кульман) на расслабленне ад працоўных турбот і на абавязковыя пачастункі, якія яна заўсёды мела для гасцей. Малодшы брат Жэня спачатку быў проста "малодшым", не роўняй нам. Але вельмі хутка ён стаў нашым аднадумцам, хоць і абраў для сябе спецыяльнасць матэматыка. Між тым гуманітарная хатняя атмасфера і на яго ўздзейнічала, прывіла выдатныя задаткі гісторыка. Ды што тут гаварыць – Фядосікі не былі мінчукамі. Сямья перабралася ў сталіцу з далёкіх мясцін пад Мікашэвічамі. Там у вёсцы Сінкевічы Лунінецкага раёна працавалі бацькі, там нарадзіліся і пайшлі ў школу іх сыны. Таму сумяшчэнне сялянскай "закваскі" і поглядаў на чалавечыя і жыццёвыя каштоўнасці з высокім прафесійным кругаглядам, культурай, інтэлектуальнасцю і дало такія відавочныя для ўсіх, хто ведаў сям'ю Фядосікаў, пазітыўныя ва ўсіх адносінах вынікі.

Такім чынам, Віктару самой прыродай і лёсам было наканавана стаць асаблівым, не падобным на многіх, хто ішоў да прафесіі гісторыка, спазнаючы многія яе ісціны саматугам, праз унікання ў тое, што для Віктара было вядома з маленства. А тым больш – праз засваенне аграмаднісцтай інфармацыі рознага кшталту з бацькоўскай бібліятэкі. Анатоль Сямёнавіч сабраў дзівосную калекцыю кніг па самай разнастайнай тэматыцы. Узгадваю свае першыя ўражанні, калі на іх кватэры ўбачыў тое, што нават у бібліятэках Мінска было не знайсці. А для Віктара гэты збор быў звыклым, ён ім карыстаўся кожны дзень. Таму і на занятках мог выдаць такое, што ўсім нам заставалася толькі патупляць свае галовы, "начыненныя" банальнымі фактамі даступных падручнікаў ці, у лепшым выпадку. інфармацыяй канспектаў. Але не гэтае галоўнае – было адразу бачна, што Віктар успрымаў і аналізаваў любую інфармацыю (агучаную ці прачытаную) хутчэй за ўсіх, мог вельмі сістэмна і даказальна, а галоўнае – даступна і нават проста, расказаць ці аб усіх тэмах бяконцай у тагачасным вывучэнні "гісторыі СССР", ці аб напалеонаўскіх войнах з заблытанымі па складніках і сэнсу "антынапалеонаўскімі кааліцыямі", ці бліскуча агучыць па латыні стос доўгіх прыказак і павучэнняў…

Адным словам, усе аднагрупнікі Віктара хутка "раскусілі" карані ягонай першнасці сярод іншых. І толькі па-добраму зайздросцілі, імкнучыся самім нарасціць інтэлектуальны багаж як мага хутчэй, што раз скарыстоўваючы Віктара ў самых розных вучэбных абаставінах. За лепшае – апытвалі яго перад заняткамі, а асабліва перад залікамі і экзаменамі, наконт удакладнення таго, што ведалі недасканала ці хацелі ўсвядоміць тое, што не засвоілі ўвогуле. І імкнуліся падтрымаць "марку" нашай 2-й вучэбнай групы сярод іншых чатырох на курсе. Так

натуральна сталася, што менавіта Віктар для аднагрупнікаў адразу стаў як бы “маркерам” нашых ведаў і нейкім своеасаблівым маяком, па якім звяралі свае веды і да якога імкнуліся ўрэшце рэшт “прыплыць”, гэта значыць дасягнуць дастатковай ступені прафесіяналізму як гісторыкі. Зразумела, такая ўнутраная настроенасць была хутчэй у хлопцаў. Дзяўчаты ж у большасці сваёй проста захапляліся “нашым Віценькай” і ганарыліся, што ён такі – адзін з “нашай” групы!

Праўда, у цэлым 2-я група гістфака БДУ 1968–1973 гадоў вучобы была ўнікальнай. У ёй нейкім правідзеннем сабраліся тыя, хто на самой справе жадаў пасвяціць сябе цалкам прафесіі. І ўпарта, дзень за днём, пяць гадоў без паслаблення вучыў усё і ўся, што нам дыктаваў вучэбны план нашай падрыхтоўкі. Вучылі часам абы што, забівалі мазгі відавочнай лухтой, заідэалагізаванымі штампамі, ад якіх нават нам, дзецям паслеваеннага часу, дзецям пераможцаў у крывавай вайне, было мутарна. Але ўсе дысцыпліны “грызлі” з аднолькавай упартасцю, каб толькі не падвесці сваіх выкладчыкаў, а больш за ўсё – атрымаць такія жаданыя “пяцёркі”, за якімі стаялі неабходныя для далейшай сталай працы веды! І тым самым замацаваць сваё рэнамэ сярод аднакурснікаў і ў цэлым на факультэце. Немалаважным фактарам была “барацьба” за павышаную стыпендыю. Як ніяк, а паміж 37 рублямі “звычайнай” і 43 рублямі і 75 капейкамі “павышанай” змяшчаўся ці то тыдзень харчавання ў студэнцкай сталоўцы, ці то амаль 7 бутэлек просценькага грузінскага сухога віна “Эрэці”. Апошняе асабліва добра суправаджала як завяршэнне спартыўных трэніровак да сёмага поту ў зале цяжкай атлетыкі, так і прыемныя таварысцкія пасядзелкі ў нашай гістфакаўскай “капейцы”. Канешне, гэтае таксама ўзрушвала нас, але галоўным было імкненне не адстаць адзін ад аднаго ў спасціжэнні ведаў. Быў нейкі азарт, інтэлектуальна-спартыўная злосць тыпу: ”я не магу быць горшым за іншых, гэта мне па плячы, гэта я павінен ведаць і выдатна агучыць ці напісаць”.

Такі псіхаклімат у групе быў выдатна замацаваны нашым лідарам – Віктарам ды яго (зразумела, і нашым) сябрам і пэўным сапернікам у дасведчанасці па ўсіх накірунках ведаў – Саняй. Нейкім незразумелым чынам Аркадзь Пазняк так зваўся намі ў часы студэнцтва і затым пры сустрэчах з ім і пры згадванні яго ўжо ў “прафесарскіх гутарках”. Ён увасабляў іншы, у параўнанні з Віктарам, тып студэнта-выдатніка. Калі Віктар схопліваў веды літаральна на ляту, валодаючы да таго ж іх аграмадным багажом, то Саня павінен быў упарта ўгрызацца ў кожны факт, каб ён стаў натуральнай часткай ягонай сутнасці. А яна патрабавала, каб інфармацыя карпатліва і штодзённа збіралася, асэнсоўвалася, разбіралася на дробязі і зноў збіралася ў адзінае цэлае. Такі падыход да вучобы для Сані патрабаваў незвычайнай упартасці, карцення над кнігамі і на занятках. Нам усім здавалася, што Віктару вучоба давалася без асаблівых намаганняў, была ў радасць, пакідала час для рэгулярных заняткаў цяжкай атлетыкай, для арганічнай уключанасці ў шматлікія студэнцкія мерапрыемствы і сяброўскія сустрэчы. А Саня, у адрозненне ад Віктара, ішоў больш цяжкім шляхам, павінен быў увесь цалкам аддавацца вучобе, хаця і не быў банальным “зубрылай”. Наадварот, ён выдзяляўся, як і Віктар, відавочнымі здольнасцямі. І не толькі гісторыка, а і гуманітарыя ў цэлым.

Між тым вынік працы гэтых двух “інтэлектуальных тытанаў” 2-й групы гістфака быў аднолькавы. Абодва вучыліся толькі на “5” і астатнія адзнакі лічылі ніжэй сваёй годнасці. А мы, іх таварышы, нават і не маглі сябе ўявіць, што яны атрымаюць пракол на практычных занятках, а тым больш на экзаменах нават у самых патрабавальных выкладчыкаў. Цяпер, праз дзесяткі гадоў свай выкладчыцкай працы, усведамляеш, якое задавальненне было ў нашых прафесараў

ды дацэнтаў, калі яны вялі дыялогі і з Віктарам, і з Саняй. Некаторыя моманты ўзгадваюцца. У памяці паўстаюць прафесійныя дыялогі на практычных занятках, якія вялі з імі Эдуард Міхайлавіч Загарульскі, Мікалай Паўлавіч Палетыка, Леў Міхайлавіч Шнеерсон, Анатоль Іосіфавіч Кажушкоў і шмат іншых нашых выдатных настаўнікаў. Нават непрадказальны Лаўрэнцій Сямёнавіч Абэцэдарскі ці вытанчаны і звернхпатрабавальны да ведання дробязяў Валянцін Навумавіч Рабцэвіч ніколі не маглі пахіснуць дасканаласць ведаў нашых Віктара ды Сані.

На працягу пяці гадоў натуральным чынам склаўся і дзейнічаў гэты тандэм. Ён не даваў перапынку астатнім, зрушваў да працы нават там, дзе можна было і злавіць салодкую студэнцкую "халяву" у падрыхтоўцы, у засваенні ці ігнараванні нейкіх там "непатрэбных" ведаў. Усе вучыліся на поўную катушку, кіруючыся на нашых Віктара ды Саню. Мабыць таму, 2-я група гістфака тых гадоў у хуткім часе стала лідарам па паспяховасці, удзелу ў грамадска-палітычных мерапрыемствах, у сваіх спартыўных поспехах, спачатку на факультэце, а потым і ў БДУ ў цэлым. І аднойчы злёгку выйграла ў адпаведным па накірунках "сацыялістычным спаборніцтве" паездку за мяжу! У, аж ва ўсіх дух тады захапіла, Чэхаславакію! Праўда, вельмі хутка гэты дух прыйшлося спусціць. На паверхню выплыла "антысаветчына", якую цэлай групе прыпісалі пільныя, як заўсёда, адпаведныя службы. Не хацелася б у дадзеным выпадку ўдавацца ў падрабязнасці. Якім чынам гэтыя органы змаглі ўбачыць у гумарлівым прапісванні і размалёўванні адной з паўсядзённых фізіялагічных спраў кожнага чалавека (без уліку яе адносінаў да палітычных сістэм) крамолу, цяжка зразумець і сёння. Спроба ж хоць нейкім чынам укласці сумныя ідэялагемы ў гумарлівыя формы рукапіснага трактату каштавала для некаторых нерваў, а для ўсёй групы – паездкі за мяжу. На яе проста было накладзена "вета".

Гэтыя ўспаміны пасля 70-ці сваіх пражытых гадоў карціць прадаўжаць і прадаўжаць. Як ніяк, а студэнцкія як бы толькі пяць гадоў у атачэнні выдатных выкладчыкаў і аднакашнікаў былі і застаюцца самым цёплым і адначасова самым вызначальным перыядам жыцця. Якраз тады і былі закладзены для многіх з нас цагліны ў падмурак прафесійнасці – выкладчыцкай і навуковай працы па калісьці абраным шляху. І кругабег жыцця не дэвальвіраваў той час, а наадварот пастаянна прымушаў звяртацца да пачатку яскравых, а з цягам і ўсё больш важных для знаходжання свайго месца ў прафесіі і жыцці студэнцкіх гадоў. Цяпер можна крыху прыпыніць гэты самы кругабег, больш уважліва азірнуцца назад, зноў у думках прайсціся разам з таварышамі па вуліцах Мінска, па ягоным на той час адзіным праспекце імя Леніна, які распачынаўся плошчай Леніна з нашым родным універсітэтам зноў жа імя Леніна, у якім на 5–6 паверхах яго Галоўнага корпуса размяшчаўся наш гістфак. Зноў хацелася з імі пасядзець у перапоўненых наведавальнікамі-чытачамі галоўнай ці "беларускай" залях Дзяржаўнай бібліятэкі імя…таго ж самага Леніна. А пасля, пад вечар, спусціцца ў падвалы корпуса юрфака ва Універсітэцкім гарадку, каб накачаць мышцы "гірамі", "блінамі", "грыфамі" дзеля дэманстрацыі сваіх фізічных кандыцый трэнерам Алегу Сяргеевічу Сауніну і Віктару Фёдаравічу Кавалёву, як і самому сабе – што не навукай і вучобай адзінымі ты жывеш, што твая "фізуха" на зайздрасць іншым хлопцам. А болей, каб пафарсаваць біцэпсамі ды трыцэпсамі перад дзяўчатамі, якія ў нашай групе былі самымі прываблівымі... Пасля ж чарговай летняй сесіі ва ўсіх адносінах някепска было махнуць у складзе будатрада за рамантыкай і неблагім рублем куды-небудзь на поўнач велізарнага Саюза ці бліжэй – па Беларусі.

Успаміны, успаміны… А за імі і ты сам, і твае аднакашнікі. Вось і Віктар з гадамі часценька ў нашых бяседах узгадвае тое ж, што і ты лічыш самым важным.

Ён, выдатнік вучобы, быў зусім не публічны ў праявах “грамадскай работы”. Нават цураўся яе. Але набіраў “ачкі” перад намеснікам дэкана па гэтай самай рабоце Уладзімірам Антонавічам Цітком сваёй спартыўнай упёртасцю, імкненнем быць першым і на памосце, дзе ліха распраўляўся са штангай, лічыўся самым перспектыўным “жымавіком” – гэта значыць на дзіва зашмат падымаў кілаграмаў у першым відзе тагачаснага трохбор’я (жым, рывок і штуршок). Віктар адзначыўся ўдзелам у рэстаўрацыі Брэсцкай крэпасці, калі як “баец” студатрада два летнія месяцы мясіў цэментны раствор і скакаў па рыштаваннях з насілкамі цэглы і вёдрамі гэтага раствору. Там і знайшоў сваю “палавінку” – студэнтку-філалагіню Алену з знакамітага роду Законнікавых. Успаміны, успаміны..

Між тым гэтыя і іншыя студэнцкія турботы і памкненні былі другаснымі для Віктара ў параўнанні з глыбока асэнсаванай мэтай, якая відавочна праглядалася ўсім нам у яго вучэбнай апантанасці. Мэтай была навука гісторыя! Хлапец не толькі сам імкнуўся пайсці шляхам свайго бацькі Анатоля Сямёнавіча, але проста прыродна, з дзяцінства быў для яе сфарміраваны. Здольнасці да засваення замежных і старажытных моў скіравалі яго на кафедру, якую тады ўзначальваў факультэцкі “мэтр”, легенда і аўтарытэт – прафесар-антыказнаўца Фёдар Макарьевіч Нячай. Трэба сказаць, што большасць першакурснікаў “прапускалася” праз кафедру старажытнага свету і сярэдніх вякоў для напісання першых сваіх як бы навуковых (!) прац – курсавых. Вось і мне самому таксама давялося карцець пад кіраўніцтвам прафесара Гілера Маркавіча Ліўшыца над спазнаннем прычын і наступстваў “Замовы Кацілiны”. Але нямногія потым вырашалі прадоўжыць сваю спецыялізацыю па гэтаму складанаму накірунку гістарычных ведаў. Ды і зусім мала хто падыходзіў для кафедры, дзе з часоў М. М. Нікольскага (гэта значыць з 1921 г.) царыла атмасфера акадэмічнасці, пэўнага ігнаравання суетнасці навістаў, беларусазнаўцаў, а тым больш знаўцаў расійска-савецкай гісторыі ў фармаце “гісторыі СССР”. Усе яны павінны былі адсочваць “лінію партыі” у галіне гісторыі, прыстасоўваць мінуўшчыну да патрэб сучаснай палітычнай рэчаіснасці і замшэлых за больш чым 50 гадоў савецкай улады ісцін і ідэялагем.

А вось антычнікі ды медыявісты гістфака знаходзіліся ў іншым навуковым свеце, дзе на першым месцы стаяла праблема спазнання далёкага мінулага далёкіх ад нас краін і народаў. Спазнання за кошт новага прачытання старых і вядомых у навуцы крыніц, а калі пашанцуе, то за кошт увядзення ў навуковы зварот нечага новага, малавядомага. Увогуле, нават для нас, студэнтаў рубяжу 60–70-х гадоў, было дзіўным, што ў савецкай Беларусі маецца такая навуковая школа, што нашы выкладчыкі прайшлі сваю вытанчаную падрыхтоўку ў Ленінградзе ды Маскве, ведаюць не толькі мёртвыя латынь і старажытнагрэчаскую мову, але зусім зніклую хецкую, з якой на першую лекцыю па гісторыі старажытнага Усходу ў пачатку кастрычніка 1968 г. да нас “зялёных” першакурснікаў у 607-ю аўдыторыю Галоўнага корпуса прыйшоў Генадзь Іосіфавіч Даўгяла. І было відавочна, што кафедра займаецца “сапраўднай” гісторыяй, разблытвае “легенды і міфы” старажытнасці, каб знайсці там адказы на хвалюючыя ўсіх нас пытанні – Адкуль мы? Дзе нашы карані? Якое дачыненне мы маем да тых слаўных цывілізацый? Што чакае нас у будучыні? Вось толькі патрэбна было мець нейкі асаблівы запал, каб з савецкай рэчаіснасці з яе партыйна-камсамольскай дадзенасцю і штодзённымі рознымі сацспаборніцтвамі “запрыгнуць” у антычнасць да элінаў, да іх алімпійскіх багоў, успрыняць сэнс траянскіх ды пунічных войнаў і г.д.

Таму падаўляючая большасць студэнтаў гістфака прагматычна абірала для свайго прафесійнага станаўлення кафедру гісторыі КПСС, нейкая частка – кафедры гісторыі СССР і Новай і Навейшай гісторыі, зусім мала – кафедру гісторыі БССР.

Для так званых “капэсэснікаў” адкрываліся неабсяжныя прафесійныя даляглядзы. Спецыялізацыя па іншых кафедрах была дастаткова перспектыўнай толькі ў выпадку паступлення ў аспірантуру. А месцаў у аспірантуру па гэтых кафедрах для выпускнікоў нават універсітэцкага гістфака выдзялялася міністэрскімі чыноўнікамі ад сілы 1–2 на год. Тады як па двух агульнаўніверсітэцкіх кафедрах гісторыі КПСС заўсёды было зашмат і аспірантскіх месцаў, і жадаючых стаць “навуковым авангардам” улад.

Разлік на тое, што нават самы здольны выпускнік гістфака абавязкова будзе заўважаны і для яго навуковай кар’еры гасцінна адчыняць дзверы, не меў пад сабой аніякіх падстаў. Тут патрэбны былі не толькі талент студэнта-даследчыка, але і прысутнасць “гаспадыні фартуны”, зыходжанне ў адну кропку зорак лёсу. А каб пасля аспірантуры і абароны “нужной” дысертацыі яшчэ і разлічваць на выкладчыцкую пасаду ў сваёй роднай альма матэр – гэта нейкае фантазёрства і адрыў ад рэалій жыцця. Па сутнасці, і Віктар, і зашмат хто з ліку яго аднакашнікаў змаглі-такі сваё сталае прафесійнае жыццё правесці ў “абдымках Кліо”. Але толькі пасля доўгай і вельмі жорсткай барацьбы за месца “пад сонцам”. Хаця гэтае “сонца”, а значыць праца навукоўца і выкладчыка вну, як ласкавае, так і зусім пякучае. Навука гісторыя і выкладанне гісторыі ў студэнцкіх аўдыторыях, дыскусіі і спрэчкі па бязмернай колькасці навуковых і “актуальных” пытанняў патрабуюць паўсядзённасці для ўмацавання сваёй кваліфікацыі і ведаў, дакладнасці, аргументаванасці, валодання словам і пяром і зашмат чаго іншага. Быць гісторыкам – значыць цалкам пасвяціць сябе напружанай інтэлектуальнай працы, калі кожны інфармацыйны пасыл мае для цябе пэўную важнасць, можа спатрэбіцца цяпер жа ці праз нейкі час. Патрэбна самому ініцыяраваць распрацоўку той ці іншай навуковай праблемы, праводзіць гады за пошукам “залатога зерня” у безліч крыніц. Штурхаць кожны раз самога сябе і некаторых сваіх калег, каб не застыць у прафесіі і быць патрэбным для навукі, а галоўнае – для студэнтаў.

Калі згадаць эпізоды на шляху Віктара да яго сённяшняга навуковага аўтарытэту, то пакінуўшы для іншага выпадку прагляд ягоных курсавых ды дыпломнай прац (а лепей хацелася б прачытаць аб гэтым ва ўспамінах самаго Віктара Анатольевіча), спашлюся на ўражанні, якія адкладаліся за некалькі гадоў пасля атрымання нашым курсам поўнавартасных дыпломаў аб вышэйшай адукацыі з кваліфікацыяй “Гісторык. Выкладчык гісторыі і грамадазнаўства”. Першая частка гэтага запісу якраз і канстатавала, што мы ўсе прыгатаваныя і да навуковай працы. Аднак аспірантам стаў толькі Віктар. Дзесяткі іншых па размеркаванню адправілі на “вытворчасць” – у школы. У лепшым выпадку некалькі “капэсэснікаў” прынялі асістэнтамі ў розныя вну рэспублікі. Ды і месца ў аспірантуру для зверхталенавітага выпускніка 1973 года было “прабіта” факультэтам у апошні момант. А вось таксама “круглы” выдатнік з “чырвоным” дыпломам Саня Пазняк вымушаны быў надзець пагоны лейтэнанта і два гады “адбухаць” на поўначы ў якасці наглядчыка за зэкамі ў адной з калоній, месца размяшчэння якой потым было мастацкі паднесена савецкаму кінаману ў знакамітым фільме Васіля Шукшына “Калина красная”. Гэтыя гады для яго сталі добрай школай жыцця, але поўнасцю адсунулі ад навукі, у якой Саня мог бы дасягнуць відавочных вышынь. Між тым студэнцкая дружба паміж пастаяннымі намінантамі ва ўсім БДУ “ленінскай” і “марксаўскай” стыпендый засталася.

Некалькі гадоў таму Віктар (пардон, ужо Віктар Анатольевіч) перадаў мне для азнаямлення пісьмо, дасланае з Ленінградскага гатэлю АН СССР Саняй-лейтэнантам да Віці-аспіранта. Не ўтрымаюся, каб з дазволу нашага юбіляра цалкам яго прывесці тут, бо тэкст пісьма ад 28 лютага 1974 г. вельмі шчыры і

адначасова прафесійны, хаця ўжо добра адчуваецца змена жыццёвых каардынат. Нягледзячы на тое, што з часу разлёту з універсітэцкага гнязда яго птушанят прайшло толькі 8 месяцаў...

*«Здравствуй, Витя!*

*Давно не приходилось мне писать письма в твой адрес, тут, конечно, я здорово виноват, но ей-богу делов как-то свалилась целая куча, и пока разгребал я эту кучу, прошло порядком времени.*

*Я сегодня присутствую на занятиях с комсомольскими активистами внутренних войск всего северо-запада России, которые проходят в г. Ленинграде, в здании, где в прежние времена располагались штаб и казармы Семеновского полка, а ныне – наш руководящий центр. В метрах 60 отсюда находится и наша гостиница, в которой мы прожили уже три и осталось еще 2 дня. Все эти строения размещены в самом центре города, на Дворцовой площади и, даже больше того, казармы Семеновского полка соединены специальным проходом с Зимним дворцом. А в гостинице, совсем недавно бывшей жилым домом, проживали когда-то многие знаменитые личности, в том числе два историка: Струве и Тарле. Как видишь, вокруг одни достопримечательности. Вспомнил я, что семь месяцев назад мы Лёшей (*гэта ўзгадваецца наш аднагрупнік, цяперашні доктар гістарычных навук Аляксей Міхайлавіч Літвін, які таксама вымушаны быў два гады пасля заканчэння гістфака адслужыць лейтэнантам Унутраных войскаў, але ў Беларусі – Аўт.*) ранним утром подошли к этим же домам, желая занять комнату непременно с видом на Неву, поспешили за ворота, где нас поджидало жесточайшее разочарование, утрата свободы и централизованный выезд в учебные лагеря. Ну, а обо всем последующем, мне кажется, ты осведомлен неплохо. Разве что исключение составляют самые последние события.*

*Суть их в том, что я уже не Санька-взводный, не хожу больше по ночам с заряженным пистолетом, стал забывать, что такое строевая подготовка. Нынче моя должность посолиднее: секретарь комитета комсомола в/ч 7409. Вишь, как круто все изменилось. У меня даже появился в штабе свой стол, вернее даже два стола и несгораемый сейф. Только сидеть за ним подолгу не придется. Много рот и взводов расположены далеко от Вологды, так примерно километров за 270–350, а одна штука и того подальше. А мне надо всюду ездить контролировать и руководить комсомолом. А когда уезжаю, так командир полка кроме всего прочего столько задает поручений всяких, начиная от проверки службы и кончая проверкой работы по следу служебно-розыскных собак, что крутишься, как угорелый.*

*Зато в Ленинграде буду почаще. Ну, а весной, когда не надо будет таскать шинели, возьму с собой в сумку гражданскую шмотку, переоденусь и прилечу на вечерок в Минск. А то как-никак, а уже больше семи месяцев не был в нашей столице. Вообще, честно говоря, с комсомолом у нас в Вологде полнейший завал. Я даже не знаю, с чего начинать – настолько все запущено и заброшено моими предшественниками. Даже с учетными карточками полнейшая неразбериха. А через 2 месяца приедет московская ревизия и, чувствую, устроит грандиозный шухер. Поэтому надо трудиться.*

*Да, вот еще беда. Местное руководство пристало что-то уж слишком сильно – иди, мол, со 2 марта в отпуск. Видишь ли, у них там есть некий график, который ломается. Я же, разумеется, супротив. Идти же в марте нет никакого резона – холодно и неинтересно, уж лучше в сентябре, как и намечалось.*

*Ну, а пока я днем сижу и слушаю довольно интересные лекции, а по вечерам гуляю по Невскому проспекту, хожу в кинотеатры и театры, а назавтра по плану*

*предстоит посещение кабака. Надо же как-то отойти от сухой провинциальной жизни. В Ленинграде, конечно, хорошо. Только служить здесь гораздо тяжелее, чем у нас – слишком много надсмотрщиков. Да и бегут здесь от конвоя очень уж часто. А ловить потом чрезвычайно трудно. У нас же на этот счет поспокойнее. Про то, что вологодский конвой шутить не любит, сложена зэками не одна песня. Интересные они до одури. Правда, совсем недавно один парниша пробовал было сигануть в сторону, но разве человек побежит быстрее пули. Он остался живым, но все мужское хозяйство от пуль обр. 1943 как корова языком слизала. Хорошая наука другим!*

*Там скоро, пожалуй, у вас и распределение 5 курса подойдет. Интересно, как нынче все будет выглядеть? А у меня пока на прицеле только один план. После службы остаться в Ленинграде и пойти в аспирантуру. Минск, конечно, деловой город, но Ленинград...Европас-с.*

*До свидания. Привет Лене и публике. Лейтенант ВВ МВД СССР /подпись/».*

Гэтае пісьмо дае прадстаўленне аб характару ўзаемаадносін не толькі паміж двума аднадумцамі, але і ў цэлым на тым нашым курсе нашага факультэта. Гумар, падколкі адзін аднаго, не крыўдныя мянушкі – і шмат чаго іншага былі арганічным суправаджэннем студэнцкай вучобы і побыту (“публика» у дадзеным пісьме – гэта мы ўсе, аднакашнікі Сані і Віці). Імкненне прадоўжыць вучобу “на гісторыка” ужо на вышэйшым кваліфікацыйным узроўні дамінавала ў прафесійных установках многіх з аднагрупнікаў. У рэшце рэшт кандыдацкія дысертацыі ў розныя гады абаранілі, калі не памыляюся, 10 з 25 аднагрупнікаў, а яшчэ 3 ці 4 па розных прычынах не дайшлі да абароны. У гэтым асяроддзі Віктар быў першым, хто стаў кандыдатам навук. Даследаваць у аспірантуры ён пад кіраўніцтвам названага вышэй прафесара і загадчыка кафедры Ф. М. Нячая стаў святыя таінствы хрышчэння і прычасьця. Гэта значыць адразу ўхапіў актуальную праблему і для тых савецкіх гадоў (з пункту гледжання магчымай антырэлігійнай крытыкі), і на потым, калі ў постсавецкі час гісторыя ранняга хрысціянства па-ранейшаму заставалася ў навуцы дасканала не распрацаванай. І калі пад час падрыхтоўкі кандыдацкай дысертацыі (за год да яе абароны, ужо ў 1976 г.) малады даследчык сваё пранікненне ў сутнасныя палажэнні хрысціянскіх таінств і ў гістарычныя абставіны зараджэння новай сусветнай рэлігіі павінен быў суправаджаць практычнымі рэкамендацыямі для сістэмы савецкай прапаганды – праз распаўсюджаныя і папулярныя на тыя часы «Материалы в помощь лектору», то праца над доктарскай дысертацыяй “Христианская церковь в Римской империи в III – начале IV в. (становление христианской церкви и религиозная политика императорской власти)” ужо мела навуковым вынікам глыбіннае спазнанне праблемы. Адным з публічных дапаўненняў навуковых выкладак стала падрыхтоўка Віктарам Анатольевічам да друку і выданне ў 1991 г. знакамітых, але не вельмі даступных нават для спецыялістаў кніг І. Флавія і Э. Рэнана (па сутнасці, важных крыніц для кожнага даследчыка старажытнай еўрапейскай гісторыі).

Сама ж доктарская была абаронена ім на 41-м годзе жыцця. Для 1992 г., першага года беларускай суверэннасці, гэтая дысертацыя азначала сапраўдны прарыў. Яна падмацоўвалася чатырьма манаграфіямі, мноствам артыкулаў. Галоўнае ж, што такі, па-былых савецкіх мерках, малады навуковец быў дапушчыны да абароны доктарскай і бліскуча яе пераадолеў. Для нас, яго таварышаў, гэта быў першы ва ўсіх адносінах даследчык такога ўзроўню. Нават была нейкая эйфарыя, што мы ўсе як бы маем дачыненне да адбыўшайся падзеі. Як-ніяк, а большасць аднагрупнікаў і пасля выпускнога 1973 года не парывала сувязей паміж сабой, адсочвала творчыя і жыццёвыя крокі адзін аднаго. І калі сяброўскі

запіс на падораным мне аўтарэфераце быў зусім традыцыйна-афіцыйным (*«Олегу Антоновичу з глубоким уважением и наилучшими пожеланиями. 23.05.1992 г.»*), то банкетныя пачастункі з нагоды абароны ўразілі запрошаных гасцей. Атмасфера віншаванняў утрымлівала і неабходны афіцыёз, і была па-студэнцку заліхвацкай, гумарлівай, нагледзячы на прысутнасць многіх саноўных асоб, членаў Савета і інш.

Тут хацелася б крыху ўзгадаць характар узаемаадносінаў паміж амаль усімі нашымі аднагрупнікамі (у першую чаргу, паміж хлапцамі, а з цягам часу – "вучонымі мужамі"), які склаўся як бы сам па сабе: у справе вучобы, а потым навукі і педагогікі – абсалютна делавая атмасфера. А вось у астатнім – гумар, падколкі, мянушкі. Праўда, без пераходу праз відавочную рысу прыстойнасці. Напрыклад, калі Віктар стаў "абрастаць" званнямі і ступенямі, калі адна за другой пайшлі ў свет ягоныя кнігі, то і тады (як і цяпер таксама) калегіяльна-сяброўскія пасвячэнні на падораных ім кнігах заўсёды пісаліся як з традыцыйным сур'ёзам, так і заліхвацкі, з гумарам. Не ўтрымаюся, прывяду некалькі такіх пасвячэнняў. На манаграфіі «Таинства без тайн. Возникновение и социальная сущность первых христианских таинств» (Мінск, 1979) Віктар Анатольевіч, ужо кандыдат навук, напісаў: *«Олегу от Вити. Расти большой и толстый. От автора. 30.III. 1979»*). У разгар нашых сумесных "маржаванняў" Віктар, як адзін з аўтараў кафедральных нарысаў «И живы памятью столетий» (Мінск, 1987) – аб правадырах народных рухаў у сярэдневяковай Еўропе (ён напісаў нарыс аб Арнольдзе Брэшыанскім), – зрабіў такі запіс: *«Олегу Антоновичу с искренним уважением и пожеланием долгого-долгого бега при хорошем здоровье и теплой проруби. 14.I. 88 г.»*. А таўсценная "Иудейская война" Іосіфа Флавія (Минск, 1991) суправаджалася яшчэ больш дакладнай канстатацыяй тагачаснай сітуацыі ў жыцці абодвух; *«Олегу Антоновичу с пожеланием хорошего аппетита, богатства и счастья в земной жизни от издателей в день зарплаты. 18.Х.1991 г.»*. Праз два гады, у разгар чарговага беларускага Адраджэння, Віктар, які вырас і сфарміраваўся як навуковец сярод выдатных носьбітаў роднай мовы, па-беларуску разразіўся пасвячэннем на старонцы толькі-толькі выдадзенай кнігі "Женщины–легенды" (Минск, 1993), якая да гэтага часу, можна лічыць, з'яўляецца своеасаблівым прарывам у спазнанні еўрапейскай і беларускай даўніны: *«Алегу ібн Антонавічу на добрае здароўе і са шкадаваннем аб неўдзеле ў напісанні гэтага бестсэлера ад галоўнага аўтара. 13.10.1993 г. Н. Хр.»*. Можна было б працягнуць гэты шэраг запісаў (кніг Віктар Анатольевіч і напісаў шмат, і падараваў мне амаль усе), але спынюся на невялічкім пасвячэнні, якое ён зрабіў на зборніку матэрыялаў навуковай канферэнцыі памяці беларускіх акадэмікаў і першых прафесароў БДУ М.М. Нікольскага і У.М. Перцава, што адбылася на кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў на самым зломе тысячагоддзяў. Зрабіў нашай аднагрупніцы (і маёй жонцы, дарэчы) Валянціне, якая як загадчык аддзела Інстытута гісторыі НАН Беларусі прычынілася да рэцэнзавання гэтага выдання: *«Глубокоуважаемой резензентше с наилучшими от одного из…(ну, этих самых). 20.02.2001 г.»*.

"Наш" доктар навук доўгі час заставаўся адзіным з ліку аднагрупнікаў і ўсіх аднакурснікаў. Толькі праз гады адмецяцца сваімі доктарскімі дысертацыямі згаданы вышэй Аляксей Літвін (наш "палескі казачнік Лёха"), Аляксандр Алпееў, які ішоў па навуцы ад гісторыі КПСС да філасофска-паліталагічных доследаў, Рыгор Лазько – у жыцці і ў навуцы зорак з неба не хапаўшы, але упарты ў дасягненні акрэсліных навуковых рубяжоў. Немала было і тых, хто пасля кандыдацкіх абарон намеціў тэмы сваіх доктарскіх, але ў віхуры працы так і застаўся кандыдатам у праход да навуковай фармалізаванай вяршыні. У дачыненні да Віктара нельга падыходзіць з меркамі, што ён дасягнуў сваёй вяршыні. Доктар

гістарычных навук, а ў хуткім часе і прафессар, потым загадчык вырасціўшай яго кафедры В. А. Фядосік толькі-толькі ўваходзіў у самыя цесныя і разнастайныя повязі з нашай багіняй Кліо. Ні было года, каб не друкавалася яго тая ці іншая кніга, не выходзілі дзесяткі артыкулаў. Пакрыху намеціўся адыход ад добра засвоенай тэматыкі ранняга хрысціянства. Размах мыслення і ведаў павёў сталага навукоўца ў бязмежныя прасторы Сярэднявечча, калі нават усходнеславянскія яго асаблівасці ў лёгкую сумяшчаліся прафесарам з шырокім колам заходнееўрапейскай праблематыкі. І даследчык знаходзіў і даказальна прадстаўляў і калегам, і студэнтам зусім новыя акалічнасці ў развіцці еўрапейскай цывілізацыі як адзінага цэлага, але з рэгіянальнымі прыкметамі, спецыфікай.

Адным з накірункаў рэалізацыі шырокай эрудыцыі Віктара Анатольевіча у 1990-я гады стала перавыданне малавядомых твораў па гісторыі. І не проста перавыданне, а папярэдняе навуковая апрацоўка тэкстаў, суправаджэнне грунтоўнымі прадмовамі і каментарамі. Не аднойчы да такой працы ён далучаў і некаторых з сваіх блізкіх таварышоў-калег. Так з’явіліся кнігі і аб “искушении властью» у розныя перыяды гісторыі, і аб тайнай службе Пятра Першага, і аб жартоўных прачытваннях гісторыі (расійскай і ўсеагульнай) аўтарамі часопіса «Сатирикон» і інш. Гэта значыць, што Віктар наўмысна падаваў ідэі і сам удзельнічаў у іх рэалізацыі тым, хто спецыялізаваўся ў як бы іншай для яго вобласці – расіязнаўстве. Вось толькі наш медыявіст ніколькі не саступаў ім у сваіх пазнаннях усходнеславянскай гісторыі. А часценька і пераўзыходзіў.

Гэта такая яго дасведчанасць асабліва праявілася пры напісанні living рознымі аўтарскімі калектывамі розных школьных падручнікаў. Заўважу і падкрэслю – першых падручнікаў у Беларусі, якія пісаліся і даводзіліся да беларускіх спажыўцоў (вучняў і настаўнікаў). Як гаворыцца, у гэтай справе ўсё было ўпершыню. У спрэчках, якія павялі ўніверсітэцкія і акадэмічныя гісторыкі наконт аптымальнага вырашэння агульнай праблемы – “якім павінен быць беларускі погляд на гісторыю і як яго рэтрансліраваць па ўсіх прыступках адукацыйнай лесвіцы”, натужна нараджалася канцэпцыя гістарычнай адукацыі. Віктар Анатольевіч натуральна стаў адным з тых, хто быў у аўтарытэце ў гэтых спрэчках і адстаяў парадыгму падручнікаў для двух адукацыйных канцэнтраў. У тым ліку і ідэю сумяшчэння пад адной вокладкай гісторыі сярэдніх вякоў усяго еўраазіяцкага кантыненту. Асобная “гісторыя СССР” у беларускіх школах і вну ціха “почила в Бозе”, увайшоўшы натуральным складнікам у такія падручнікі. Сам Віктар Анатольевіч з часу друкавання ў 1993 г. на беларускай і рускай мовах самага першага школьнага дапаможніка “Гісторыя сярэдніх вякоў” (Мінск : Народная асвета, 1993. – 271 с.), а праз год “Усеагульная гісторыя ад старажытных часоў да канца XVIII ст. (Мінск : Народная асвета, 1994. – 350 с.) на амаль што 30 гадоў стаў і адным з аўтараў, і навуковым рэдактар гэтых і іншых мноства разоў перапрацаваных падручнікаў. Тое, што сёння беларускія школы маюць дастаткова адмысловыя ў навуковым, метадычным і дызайнерскім сэнсе падручнікі па гісторыі ў цэлым вялікая заслуга ўніверсітэцкага медыявіста з універсальнай навуковай падрыхтоўкай і кваліфікацыяй.

Гэтыя нататкі не з ліку “успамінаў”, а тым больш “мемуараў”. Проста хацелася з нагоды знакавай падзеі ў жыцці майго сябра, калегі, аднагрупніка, спадарожніка па жыцці і ў навуцы згадаць некаторыя эпізоды яго цікавай і павучальнай біяграфіі. Згадаць і не зманіць, не падпусціць флёру там, дзе і сам з’яўляўся непасрэдным сведкай (калі не больш) развіцця сталай біяграфіі юбіляра. Проста прыйшлося пакласці на паперу крыху з таго, аб чым я з Віктарам сотні разоў узгадвалі падчас студэнцтва, напісання сваіх дысертацый, ранішніх

спартыўных прабежак з абавязковым “маржаваннем” у любое надвор’е ў водах Камсамольскага возера, у часы сямейных сустрэч на кватэрах ці па вуліцы Веры Харужай (маёй) ці Кульман (Віктара), у “паляваннях” за баравікамі і падасінавікамі на Лагойшчыне ці начным “паляванні” з ліхтарыкамі за ракамі на возеры бліз вёскі на Ушаччыне, дзе жылі ягоныя цешча і цесць Законнікавы. Зразумела, многае было прагаворана, калі штодня на працягу гадоў вярталіся пешшу з “свайго” адзінага на абодвых гістфакаўскага намесніцкага кабінета (ён быў намеснікам дэкана па навуцы, а я – па вучэбнай рабоце), а потым “сваіх” жа кафедраў на Чырвонаармейскай, 6. А колькі было дыскусій і нават крыўд пры перапрацоўцы сумесных падручнікаў! Кожны ж меў свой погляд на тое, што “адразаць-выкідваць”, а што астаўляць шкалярам на засваенне і як рэагаваць на міністэрскія прадпісанні. Мне ж хацелася, каб гісторыя Русі–Масковіі не скукожылася перад заходнееўрапейскім сярэднявеччам. Але заўсёды знаходзілі пагадненне, асабліва бачачы, што там “на версе” больш за ўсё клапоцяцца аб перманентнай спрошчанасці вучэбных тэкстаў, а не іх дасведчанасці і гармоніі ў прадстаўленні. Таму ў апошні час у абоіх прапала жаданне працягваць займацца гэтай справай, даводзіць да абсурда тое, чым мы літаральна жылі столькі гадоў….

Адным словам, хацелася б завершыць свае нататкі аб “эпізодах” у жыцці майго сябра канстатацыяй, якую ў прыватнай сітуацыі як бы не прынята агучваць. Бо ўсё ўсім і так відавочна і навошта патрасаць паветра. Для дадзенага ж фармата, лічу, неабходным у каторы раз падкрэсліць: Віця, Віктар, Віктар Анатольевіч, прафесар В. А. Фядосік быў народжаны для таго, каб стаць гісторыкам. Ён змог сфакусіраваць у сабе самыя выдатныя якасці сваіх маці і бацькі, іх высокую інтэлектуальнасць, пяшчотнасць да дзяцей, гаспадарлівасць, працавітасць. Якраз апошняя рыса натуральна дапоўніла талент, каб ён расквітнеў на поўную моц. І гэта адбылося! Сёння навуковы аўтарытэт Віктара Анатольевіча Фядосіка безумоўны. А ягоны педагагічны, выкладчыцкі талент толькі дапаўняе гэты аўтарытэт. Прафесарская кафедра (як праява кваліфікаванасці выкладчыка-навукоўца) гістфака БДУ, якую ўвасабляе наш юбіляр на працягу многіх дзсяцігоддзяў, ужо цяпер абсалютна параўнальна з тымі кафедрамі, якія сталі легендамі і гонарам усёй беларускай гісторыі – прафесараў М. М. Нікольскага, С. А. Ляскоўскага, А. М. Ясінскага, У. М. Перцава, Ф. М. Нячая, Г. М. Ліўшыца і іншых гісторыкаў БДУ.

Калі на цяперашні люты 2021 года Віктар Анатольевіч каля 53 год ідзе ў “абдымку з Кліо”, то хацелася б яму пажадаць быць прылашчаным нашай багіняй і да стогадовай яго інтэлектуальнай і фізічнай бадзёрасці!

*прафесар А. А. Яноўскі*